**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар Інстытута журналістыкі
_______________ С. В. Дубовік
(подпіс) ( І.ІпБ.Прозвішча)
07.02.2012
(дата зацвярджэння)

Рэгістрацыйны № УД-S-092/р.

# РЭДАГАВАННЕ МАСТАЦКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

(назва дысцыпліны)

**Вучэбная праграма для спецыяльнасці:**

**1-23 01 10 «Літаратурная работа (па напрамках)»**
**(1-23 01 10-02 "Літаратурная работа (рэдагаванне)")**

Факультэт журналістыкі
(назва факультэта)

Кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання
(назва кафедры)

Курс (курсы) 4

Залік 8
(семестр)

Семестр (семестры) 8
Лекцыі 44
(колькасць гадзін)

Практычныя (семінарскія)
заняткі 16
(колькасць гадзін)

КСР 8
(колькасць гадзін)

Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне
68
(колькасць гадзін)

Усяго гадзін
па дысцыпліне 110
(колькасць гадзін)

Форма атрымання вышэйшай
адукацыі вочная

Склаў А. У. Дуброўскі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(І. ІпБ. Прозвішча, ступень, званне)

2012 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе базавай вучэбнай праграмы “Рэдагаванне мастацка-публіцыстычных матэрыялаў”, 31.10.2011, рэг. № УД-S-14/баз.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры
стылістыкі і літаратурнага рэдагавання
(назва кафедры)

____________________
(дата, нумар пратакола)

**Загадчык кафедры**

________________ В. І. Іўчанкаў
(подпіс) ( І.ІпБ.Прозвішча)

Адобрана і рэкамендавана да зацвярждэнння вучэбна-метадычнай (метадычнай) камісіяй факультэта журналістыкі

____________________
(дата, нумар пратакола)

**Старшыня**

________________ В. М. Самусевіч
(подпіс) (І.ІпБ.Прозвішча)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна спецыялізацыі "Рэдагаванне мастацка-публіцыстычных матэрыялаў" мае цесную сувязь з курсам "Методыка літаратурнага рэдагавання", які вывучаецца студэнтамі спецыяльнасці "Літаратурная работа (рэдагаванне)" у 5–7 семестрах і ўваходзіць у цыкл агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін. У той жа час вывучэнне прадмета грунтуецца на ведах па тэорыі журналістыкі і методыцы журналісцкай творчасці, што забяспечвае арганічнае спалучэнне практычных навыкаў стварэння медыятэкстаў і ўсвядомленага падыходу да іх рэдагавання.

Падрыхтоўка рэдактара прадугледжвае фарміраванне рэдактарскай кампетэнцыі, арыентаванай на працу з тэкстамі разнастайных стыляў і жанраў. Курс "Рэдагаванне мастацка-публіцыстычных матэрыялаў" накіраваны на рэдагаванне журналісцкіх тэкстаў, аднесеных да мастацка-публіцыстычных жанраў, якія складаюць значную частку кантэнту сучасных СМІ.

Мэтай дысцыпліны спецыялізацыі "Рэдагаванне мастацка-публіцыстычных матэрыялаў" з'яўляецца прафесійна арыентаванае засваенне методыкі рэдагавання мастацка-публіцыстычных матэрыялаў рознай жанравай прыналежнасці.

Гэта дасягаецца вырашэннем агульных і прыватных задач:

– прафесійнае авалоданне прыёмамі рэдактарскага аналізу і ацэнкі мастацка-публіцыстычных матэрыялаў;

– выпрацоўка ўменняў індывідуальнага падыходу да аўтарскага тэксту з захаваннем яго мадальнасці і ўлікам камунікатыўных магчымасцей спажыўца;

– засваенне прыёмаў ацэнкі спосабаў дасягнення камунікатыўнага ўзаемадзеяння;

– усвядомлены падыход да рэдагавання мастацка-публіцыстычных матэрыялаў рознай жанравай прыналежнасці;

– матываванае правядзенне моўна-стылёвай праўкі.

У выніку засваення курса "Рэдагаванне мастацка-публіцыстычных матэрыялаў" студэнты павінны:

– адрозніваць жанравую прыналежнасць мастацка-публіцыстычных матэрыялаў і характарызаваць іх асаблівасці;

– ведаць асноўныя структурныя схемы пабудовы асобных жанраў мастацка-публіцыстычных матэрыялаў;

– праводзіць рэдактарскі аналіз і ацэнку нарыса, эсэ, фельетона, памфлета, перыферыйных мастацка-публіцыстычных жанраў з пазначэннем станоўчых і адмоўных якасцей канкрэтнага тэксту;

– умець аргументавана абгрунтоўваць свае рэдактарскія рашэнні;

– выпрацоўваць стратэгію рэдактарскіх дзеянняў з улікам асаблівасцей кожнага тэксту;

– рэдагаваць мастацка-публіцыстычныя матэрыялы з улікам іх жанравай прыналежнасці.

Дысцыпліна спецыялізацыі "Рэдагаванне мастацка-публіцыстычных матэрыялаў" выкладаецца на працягу 8-га навучальнага семестра з формай кантролю ведаў – залікам. У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны адводзіцца 110 гадзін, з якіх 68 гадзін – аўдыторныя (44 гадзіны – лекцыі, 16 гадзін – практычныя заняткі, 8 гадзін – кіруемая самастойная праца студэнта).

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

| № п/п | Найменне раздзелаў, тэм | Колькасць гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Аўдыторныя | | | | Самаст. работа |
| | | Лекцыі | Практыч., семінар. | Лаб. занят. | КСР | |
| 1 | Асаблівасці мастацка-публіцыстычных матэрыялаў, крытэрыі іх ацэнкі. | 2 | | | | 6 |
| 2 | Прымяненне да мастацка-публіцыстычных матэрыялаў агульнай методыкі рэдагавання. | 12 | 4 | | 2 | 6 |
| 3 | Нарыс і яго віды. Асаблівасці рэдагавання нарысаў. | 8 | 4 | | 2 | 6 |
| 4 | Эсэ і яго віды.<br>Асаблівасці рэдагавання эсэ. | 8 | 2 | | 2 | 6 |
| 5 | Фельетон і яго віды.<br>Асаблівасці рэдагавання фельетона. | 6 | 2 | | 2 | 6 |
| 6 | Памфлет. Асаблівасці рэдагавання памфлета. | 2 | 2 | | | 6 |
| 7 | Перыферыйныя мастацка-публіцыстычныя жанры. | 6 | 2 | | | 6 |
| | *Усяго*: | 44 | 16 | | 8 | 42 |

## Вучэбна-метадычная карта

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі (і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семіарскія) заняткі | Лабараторныя заняткі | Кантралюемая самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | Асаблівасці мастацка-публіцыстычных матэрыялаў, крытэрыі іх ацэнкі. | 2 | | | | | а) 7, 13, 16, 21;<br>б) 1, 2, 3, 6, 9. | |
| 2. | Прымяненне да мастацка-публіцыстычных матэрыялаў агульнай методыкі рэдагавання.<br>Ідэалагічны аспект рэдагавання мастацка-публіцыстычных матэрыялаў. Дзеянні рэдактара ў рэчышчы ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. | 2 | | | | | а) 1, 2, 3, 4, 5, 9, 10, 11, 13, 14, 15, 17, 18, 19;<br>б) 5, 11, 12. | |
| 3. | Аналіз кампазіцыі разнастайных мастацка-публіцыстычных матэрыялаў. | 2 | | | | | а) 1, 2, 3, 4, 5, 9, 10, 11, 13, 14, 15, 17, 18, 19;<br>б) 5, 11, 12. | |
| 4. | Праверка мастацка-публіцыстычных матэрыялаў на захаванне законаў логікі. Закон тоеснасці як падстава захавання цэласнасці тэксту. Парушэнне законаў супярэчнасці і выключанага трэцяга. Закон дастатковай падставы ў фармуляванні аўтарскіх ацэнак і меркаванняў. | 2 | | | | | а) 1, 2, 3, 4, 5, 9, 10, 11, 13, 14, 15, 17, 18, 19;<br>б) 5, 11, 12. | |
| 5.<br><br>6. | Аналіз фактычнага матэрыялу ў тэкстах мастацка-публіцыстычных жанраў.<br>Інфарматыўнасць як адна з характарыстык тэксту. Крыніцы праверкі фактычнага матэрыялу. | 2 | 2 | | | карткі-заданні | а) 1, 2, 3, 4, 5, 9, 10, 11, 13, 14, 15, 17, 18, 19;<br>б) 5, 11, 12. | практ. раб. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.<br><br><br>8. | Асаблівасці моўна-стылістычнай праўкі мастацка-публіцыстычных матэрыялаў. Праца рэдактара над лексікай твора.<br>Лексічныя сродкі вобразнага маўлення. Крытэрыі рэдактарскай ацэнкі фонікі тэксту. | 2 | 2 | | | карткі-заданні | а) 1, 2, 3, 4, 5, 9, 10, 11, 13, 14, 15, 17, 18, 19;<br>б) 5, 11, 12. | практ. раб. |
| 9.<br><br>10. | Крытэрыі рэдактарскай ацэнкі выкарыстання розных часцін мовы.<br>Работа рэдактара над сінтаксічнымі канструкцыямі пры рэдагаванні мастацка-публіцыстычных матэрыялаў. | 2 | | | 2 | карткі-заданні | а) 1, 2, 3, 4, 5, 9, 10, 11, 13, 14, 15, 17, 18, 19;<br>б) 5, 11, 12. | практ. раб. |
| 11. | Нарыс і яго віды. Асаблівасці рэдагавання нарысаў.<br>Сучасны нарыс: праблемы жанру. Жанравы статус нарыса. Нарыс як сінтэтычны жанр мастацкай публіцыстыкі. Віды нарыса: агульная характарыстыка. Мастацка-выяўленчыя (падарожныя нарысы, нарысы-эсэ і замалёўкі); мастацка-публіцыстычныя (партрэтныя); даследчыя нарысы. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 12. | Падарожны нарыс. Падарожныя нататкі як разнавіднасць падарожнага нарыса. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне падарожных нарысаў. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 13. | Партрэтны нарыс. Біяграфічны партрэтны нарыс. Юбілейны партрэтны нарыс. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне партрэтных нарысаў. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 14. | Нарыс-даследаванне. Судовы і бытавы нарысы. Нарыс-расследаванне. Нарыс нораваў. Праблемны нарыс. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне нарысаў-даследаванняў. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 15. | Дакументальная і мастацкая аснова нарыса. Паэтыка дакументальнага пісьма. Спецыфіка ўмоўнасці ў нарысавым творы. Мастацкія элементы нарыса: пейзаж, дэталь, партрэтная характарыстыка. Псіхалагізм у нарысе. | | 2 | | | карткі-заданні | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 16. | Паэтыка нарысавага вобраза. Гнасеалагічныя карані публіцыстычнага вобраза. Вобраз аўтара ў нарысавым творы. Функцыі аўтарскага “я” ў публіцыстыцы. | | 2 | | | карткі-заданні | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |
| 17. | Аўтар – чытыч: праблемы ўзаемадзеяння. Падзейнае адзінства нарысавага твора. Камунікатыўная дзейнасць аўдыторыі.<br>Структурная арганізацыя нарыса. Тыпы нарысавых структур. Хранікальная пабудова нарыса. Апісанне, заснаванае на логіцы прычынна-выніковых сувязей. Эсэістычная форма пабудовы. Рэдактарскі аналіз структурнай арганізацыі нарыса. | | | | 2 | карткі-заданні | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |
| 18. | Эсэ і яго віды. Асаблівасці рэдагавання эсэ.<br>Эсэ як адзін з самых запатрабаваных жанраў у сучаснай публіцыстыцы. Узнікненне і развіццё жанру. Эсэ як публіцыстычны твор своеасаблівай (адвольнай) кампазіцыі, у якім аўтар выказвае свае індывідуальныя меркавнні і ацэнкі па тым ці іншым коле праблем; публіцыстычны жанр, які выяўляе заканамернасці быцця чалавека праз адлюстраванне працэсу ўспрымання свету. Эсэ як “звышдысцыплінарны” жанр. Асацыятыўны характар сувязей паміж часткамі тэксту. Падкрэсленая суб’ектыўнасць выказвання. Паэтычна-вобразная афарбоўка, афарыстычнасць. | 2 | | | | | а) 6, 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 19. | Сэнсавы план жанру эсэ. Адбор фактаў. Падпарадкаванне фактаў руху думкі аўтара. Наданне фактам абагульнена-філасофскага сэнсу. Рэдактарскі аналіз фактычнага матэрыялу ў эсэ. | 2 | | | | | а) 6, 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 20. | Кампазіцыйна-маўленчы план жанру эсэ. Адсутнасць жорсткіх кампазіцыйна-маўленчых схем. Свабодны рух думкі; частыя пераходы ад канкрэтнага да абстрактнага. Рэдактарскі аналіз кампазіцыі эсэістычных твораў. | 2 | | | | | а) 6, 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 21. | Стылістычная мадэль жанру эсэ. Наяўнасць усіх магчымых тыпаў маўлення (разважанне, аповед, апісанне) і формаў маўлення (маналог, унутраны маналог, дыялог з уяўным апанентам і г. д.). | 2 | | | | | а) 6, 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 22. | Выкарыстанне розных тыпаў славеснасці: успаміны, афарызмы, аўтарскія каментарыі, філасофскія вывады і г. д. Стылістычныя прыёмы эсэізацыі. “Эсэма” як жанравае аб’яднанне аўтарскай думкі і вобраза. Рэдактарскі аналіз стылістычнай арганізацыі эсэістычных твораў. | | 2 | | | карткі-заданні | а) 6, 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |
| 23. | Жанравыя разнавіднасці эсэ. Эсэ-нарыс, эсэ-партрэт, эсэ-рэцэнзія, эсэ-замалёўка, эсэ-артыкул, эсэ-фельетон, эсэ-ліст і інш. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне розных жанравых разнавіднасцей эсэ. | | | | 2 | карткі-заданні | а) 6, 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |
| 24. | Фельетон і яго віды. Асаблівасці рэдагавання фельетона.<br>Фельетон як мастацка-публіцыстычны жанр, які прадстаўляе падзею ці праблему ў сатырычным або гумарыстычным асвятленні. Адрасныя і бязадрасныя фельетоны. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 25. | Падзейны фельетон. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне падзейнага фельетона. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 26. | Фельетон-разважанне. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне фельетона-разважання. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 27. | Тып апавядальніка. Апавяданне ад першай асобы і апавяданне ад трэцяй асобы. | | 2 | | | карткі-заданні | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 28. | Крыніцы камічнага эфекту. Камічны апавядальнік, камізм сітуацый і слоўны камізм. Іронія, сарказм, каламбур, стылістычны кантраст, парадзіраванне. Рэдактарскі аналіз вобразна-стылістычных сродкаў у фельетоне. | | | | 2 | карткі-заданні | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |
| 29. | Памфлет. Асаблівасці рэдагавання памфлета. Паходжанне памфлета. Вострасатырычны твор, нацэлены на высмейванне пэўных чалавечых заган і выкрыццё таго героя (герояў), які ўяўляецца аўтару носьбітам небяспечнага грамадскага зла. Адкрытая тэндэнцыйнасць, афарыстычнасць выказвання, аратарская інтанацыя, яскравая экспрэсіўнасць мовы, непрыхаваная патэтыка. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 30. | Прыёмы мастацка-публіцыстычнага асэнсавання фактаў: гратэск, гіпербала, іронія, сарказм. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне памфлета. | | 2 | | | карткі-заданні | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |
| 31. | Перыферыйныя мастацка-публіцыстычныя жанры. Статус і роля перыферыйных мастацка-публіцыстычных жанраў. “Слова” як пісьмовы варыянт эпідэйктычнай прамовы. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 32. | Пародыя; прадмет пародыі ў журналістыцы. Сатырычны каментарый; адрозненне ад аналітычнага каментарыя. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 33. | Жыццёвая гісторыя: характар адлюстравання рэчаіснасці, асаблівасці пабудовы сюжэта, стылістычныя асаблівасці. Легенда; вымысел і яго роля ў стварэнні жанру легенды; функцыі легенды ў прэсе. | 2 | | | | | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | |
| 34. | Эпіграф на старонках перыядычнага друку. Эпітафія як ацэначны жанр. Анекдот. Жарт. Гульня. Асаблівасці рэдагавання перыферыйных мастацка-публіцыстычных жанраў. | | 2 | | | карткі-заданні | а) 7, 12, 16, 20, 11;<br>б) 1, 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10. | практ. раб. |

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. Базанова, А.Е. Литературное редактирование : учеб. пособие / А.Е. Базанова. – М. : РУДН, 2008. – 202 с.
2. Голуб, И.Б. Конспект лекций по литературному редактированию / И.Б. Голуб. – М. : Айрис-пресс, 2004. – 432 с.
3. Голуб, И.Б. Стилистика русского языка / И.Б. Голуб. – М. : Рольф ; Айрис-пресс, 1997. – 448 с.
4. Голуб, И.Б. Упражнения по стилистике русского языка : учеб. пособие для вузов. – М. : Рольф ; Айрис-пресс, 1997. – 240 с.
5. Гужова, И.К. Литературное редактирование: материалы для занятий : учеб. пособие / И.К. Гужова [и др.]. – М. : МГУ, 2000. – 160 с.
6. Кайда, Л.Г. Эссе: стилистический портрет / Л.Г. Кайда. – М. : Флинта : Наука, 2008. – 184 с.
7. Ким, М.Н. Жанры современной журналистики / М.Н. Ким. – СПб. : Изд-во Михайлова В.А., 2004. – 336 с.
8. Козлова, М.М. Редактирование материалов массовой информации : учеб. пособие / М.М. Козлова. – СПб. : ИВЭСЭП ; Знание, 2009. – 78 с.
9. Колесников, Н.П. Стилистика и литературное редактирование / Н.П. Колесников. – Ростов н/Д : МарТ, 2003. – 192 с.
10. Литературное редактирование : курс лекций / под ред. Н.С. Валгиной. – Изд. 2-е, испр. и доп. – М. : МПИ, 1989. – 128 с.
11. Мильчин, А.Э. Методика редактирования текста / А.Э. Мильчин. – Изд. 3-е, перераб. и доп. – М. : Логос, 2011. – 524 с.
12. Накорякова, К.М. Литературное редактирование информационных заметок : учеб.-метод. пособие / К.М. Накорякова. – М. : Изд-во МГУ, 1990. – 48 с.
13. Накорякова, К.М. Литературное редактирование материалов массовой информации : учеб. пособие / К.М. Накорякова. – М. : Изд-во МГУ, 1994. – 189 с.
14. Накорякова, К М. Литературное редактирование. Общая методика работы над текстом : учеб. пособие / К.М. Накорякова. – М. : МГУ, 2011. – 332 с.
15. Накорякова, К.М. Справочник по литературному редактированию / К.М. Накорякова. – М. : Флинта : Наука, 2011. – 200 с.
16. Риторические основы журналистики. работа над жанрами газеты : учеб. пособие / З.С. Смелкова [и др.]. – 6-у изд. – М. : Флинта : Наука, 2009. – 320 с.
17. Сикорский, Н.М. Теория и практика редактирования : учебник для вузов по спец. «Журналистика» / Н.М. Сикорский. – 2-е изд., испр. и доп.– М. : Высш. школа, 1980. – 328 с.
18. Сметанина, С.И. Литературное редактирование для журналистов и специалистов по связям с общественностью / С.И. Сметанина. – СПб. : Изд-во Михайлова В.А., 2003. – 252 с.
19. Стилистика и литературное редактирование / под ред. В.И. Максимова. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Гардарики, 2007. – 653 с.
20. Стилистический энциклопедический словарь русского языка /

под ред. М.Н. Кожиной. – М. : Флинта : Наука, 2003. – 696 с.
21. Тертычный, А.А. Жанры периодической печати : учеб. пособие. – М. : Аспект Пресс, 2000. – 312 с.

*Дадатковая*

1. Белокурова, С.П. Словарь литературоведческих терминов / С.П. Белокурова. – СПб. : Паритет, 2006. – 320 с.
2. Ворошилов, В.В. Журналистика. Базовый курс : учебник / В.В. Ворошилов. – 5-е изд. – СПб. : Изд-во Михайлова В.А., 2004. – 704 с.
3. Дубовік, С.В. Даведнік журналіста / С.В. Дубовік. – Мінск : БДУ, 2006. – 211 с.
4. Жаўняровіч, П.П. Публіцыстычны дыскурс Уладзіміра Караткевіча / П.П. Жаўняровіч. – Мінск : РІВШ, 2011. – 244 с.
5. Іўчанкаў, В.І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В.І. Іўчанкаў. – Мінск : БДУ, 2003. – 257 с.
6. Корконосенко, С.Г. Основы журналистики / С.Г. Корконосенко. – М. : Аспект Пресс, 2001. – 284 с.
7. Основы творческой деятельности журналиста / под ред. С.Г. Корконосенко. – СПб. : Знание ; СПб. ИВЭСЭП, 2000. – 272 с.
8. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2001. – 384 с.
9. Стральцоў, Б.В. Асноўныя творчыя метады ў журналістыцы / Б.В. Стральцоў. – Мінск : БДУ, 2000. – 71 с.
10. Стральцоў, Б.В. Метад і жанр : асновы творчага майстэрства журналіста / Б.В. Стральцоў. – Мінск : БДУ, 2002. – 18 с.
11. Цікоцкі, М.Я. Стылістыка беларускай мовы : вучэб. дапам. для фак. журналістыкі / М.Я. Цікоцкі. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 294 с.
12. Цікоцкі, М.Я. Стылістыка тэксту : вучэб. дапам. для студэнтаў выш. навуч. устаноў філал. профілю / М.Я. Цікоцкі. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 223 с.

## ІІ. Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Пры ацэнцы засваення тэарэтычнага матэрыялу і яго практычнага выкарыстання ўлічваецца ўменне студэнта:

– выяўляць жанр мастацка-публіцыстычнага матэрыялу і яго канкрэтную разнавіднасць;

– праводзіць рэдактарскі аналіз мастацка-публіцыстычных матэрыялаў;

– знаходзіць шляхі паляпшэння якасных характарыстык тэксту;

– выпрацоўваць стратэгію рэдактарскіх дзеянняў;

– лагічна і доказна абгрунтоўваць рэдактарскія праўкі ў мастацка-публіцыстычным матэрыяле;

– праводзіць моўна-стылістычную праўку тэксту.

## ІІІ. Тэматыка практычных работ

1. Аналіз кампазіцыі разнастайных мастацка-публіцыстычных матэрыялаў.
2. Асаблівасці моўна-стылістычнай праўкі мастацка-публіцыстычных матэрыялаў.
3. Рэдагаванне падарожных і партрэтных нарысаў.

4. Рэдагаванне нарысаў-даследаванняў.
5. Рэдагаванне эсэ.
6. Рэдагаванне фельетона.
7. Рэдагаванне памфлета.
8. Рэдагаванне перыферыйных мастацка-публіцыстычных жанраў.

**IV. Прыкладныя пытанні да заліку**

1. Жанрава-стылістычны аспект рэдагавання мастацка-публіцыстычных матэрыялаў.
2. Жанравая класіфікацыя мастацка-публіцыстычных матэрыялаў.
3. Праверка мастацка-публіцыстычных матэрыялаў на захаванне законаў логікі.
4. Аналіз фактычнага матэрыялу ў тэкстах мастацка-публіцыстычных жанраў.
5. Аналіз кампазіцыі разнастайных мастацка-публіцыстычных матэрыялаў.
6. Праца рэдактара над лексікай мастацка-публіцыстычных матэрыялаў. Лексічныя сродкі вобразнага маўлення.
7. Крытэрыі рэдактарскай ацэнкі фонікі тэксту.
8. Крытэрыі рэдактарскай ацэнкі выкарыстання розных часцін мовы.
9. Работа рэдактара над сінтаксічнымі канструкцыямі пры рэдагаванні мастацка-публіцыстычных матэрыялаў.
10. Нарыс як сінтэтычны жанр мастацкай публіцыстыкі.
11. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне падарожных нарысаў.
12. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне партрэтных нарысаў.
13. Рэдактарскі аналіз і рэдагаванне нарысаў-даследаванняў.
14. Дакументальная і мастацкая аснова нарыса.
15. Паэтыка нарысавага вобраза. Аўтар – чытыч: праблемы ўзаемадзеяння.
16. Рэдактарскі аналіз структурнай арганізацыі нарыса.
17. Эсэ і яго віды.
18. Рэдактарскі аналіз фактычнага матэрыялу ў эсэ.
19. Рэдактарскі аналіз кампазіцыі эсэістычных твораў.
20. Рэдактарскі аналіз стылістычнай арганізацыі эсэістычных твораў.
21. Фельетон і яго віды.
22. Рэдактарскі аналіз вобразна-стылістычных сродкаў у фельетоне.
23. Памфлет. Асаблівасці рэдагавання памфлета.
24. Статус і роля перыферыйных мастацка-публіцыстычных жанраў.
25. “Слова” як пісьмовы варыянт эпідэйктычнай прамовы. Рэдактарскі аналіз вобразна-стылістычных сродкаў.
26. Пародыя як перыферыйны мастацка-публіцыстычны жанр. Рэдактарскі аналіз вобразна-стылістычных сродкаў.
27. Сатырычны каментарый як перыферыйны мастацка-публіцыстычны жанр. Рэдактарскі аналіз вобразна-стылістычных сродкаў.
28. Жыццёвая гісторыя і легенда як перыферыйныя мастацка-публіцыстычныя жанры. Рэдактарскі аналіз вобразна-стылістычных сродкаў.
29. Эпітафія як ацэначны жанр. Рэдактарскі аналіз вобразна-стылістычных сродкаў.
30. Анекдот, жарт, гульня як перыферыйныя мастацка-публіцыстычныя жанры.

ПРАТАКОЛ

**УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| **Назва дыцыліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола)** |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЯНЕННІ**
**ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**
**НА ________________________ / __________ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД**

| № п/п | Дапаўненні і змяненні | Падстава |
| --- | --- | --- |
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры

________________________________ (пратакол № _______ ад __________20 ____ г.)
*(назва кафедры)*

Загадчык кафедры

_________________________ _________________________ ______________________

*(ступень, званне)* *(подпіс)* *(І.ІпБ.Прозвішча)*

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дэкан факультэта

_________________________ _________________________ ______________________

*(ступень, званне)* *(подпіс)* *(І.ІпБ.Прозвішча)*